# САДРУЖНАСЦЬ ПАЭТЫЧНАГА РАДКА

**20 сакавіка ў Гродне зладзілі свята інтэрнацыянальнай паэзіі. У літаратурнай гасцінай пад назвай «У коле сяброў» творы сваіх любімых паэтаў на роднай мове прачыталі прадстаўнікі адразу некалькіх нацыянальнасцяў. Гучалі і аўтарскія радкі. Па запрашэнні Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага гасцямі мерапрыемства сталі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, гродзенскія паэты Кацярына Каламійцава і Дзмітрый Радзівончык. Галоўная ідэя свята – моўная разнастайнасць як падмурак гармоніі ў шматнацыянальным беларускім грамадстве. Сродкам культурнага дыялогу нацый па праве лічыцца і мова паэзіі.**

У Рэспубліцы Беларусь горад Гродна здаўна лічыцца цэнтрам міжнацыянальнай дружбы. Пацвярджае гэты статус вядомы далёка за межамі нашай краіны Фестываль нацыянальных культур, які рэгулярна прымае старажытны горад над Нёманам. Тут на гарадскіх вуліцах можна пачуць гучанне мноства розных моў і дыялектаў, сустрэць прадстаўнікоў розных народнасцяў і рас. Замежныя студэнты гродзенскіх вышэйшых навучальных устаноў – традыцыйныя ўдзельнікі шматлікіх літаратурных мерапрыемстваў. Так адбылося і зараз.



Дзявяты год кафедрай рускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы рэалізуецца ўнікальны асветніцкі праект «Садружнасць», у рамках якога з удзелам замежных студэнтаў арганізуюцца шматлікія мерапрыемствы творчага, літаратурнага накірунку, ажыццяўляецца такі неабходны і змястоўны мультыкультурны дыялог. У чарговы раз сродкам гэтага дыялогу сталі паэтычнае мастацтва, мова паэзіі. У чарговы раз пад эгідай праекта «Садружнасць» сумесна з абласной навуковай бібліятэкай імя Я. Карскага была арганізавана інтэрнацыянальная літаратурная гасціная «У коле сяброў». Мерапрыемства ўжо стала традыцыйным; у розныя гады ў рамках праекта сваю паэтычную творчасць прадэманстравалі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі:

Людміла Кебіч, Ганна Скаржынская-Савіцкая, Тамара Мазур, Святлана Тарасава, Анатоль Апанасевіч, Рыгор Гармаш і іншыя аўтары. 20 сакавіка гасцямі прыхільнікаў паэтычнага радка з розных краін сталі члены СПБ, гродзенскія паэты Кацярына Каламійцава і Дзмітрый Радзівончык.

Свята атрымалася яркім і вельмі цёплым па сваёй шчырай сяброўскай атмасферы. Экзатычны меладызм моў замежных чаргаваўся з мілагучнасцю беларускай і рускай моў. А яшчэ былі шчырыя эмоцыі, калі нешта не атрымлівалася, неабходны ў мастацтве эстэтычны антураж – нацыянальныя касцюмы і ўпрыгожванне асляпляльнай прыгажосці, якія эфектна дапаўнялі паэтычныя вобразы. Усю гэтую феерыю трэба было не толькі чуць, але і бачыць…




І ўсё ж галоўнай на сваце была паэзія. У сценах галоўнай бібліятэкі вобласці прагучалі вершы на беларускай, рускай, кітайскай, узбекскай і туркменскай мовах. Напрыклад, туркменскія студэнты прадэкламавалі творы сусветна вядомага класіка туркменскай літаратуры, паэта-філосафа Махтумкулі Фрагі (1724-1782) на мове арыгінала і ў перакладзе на рускую мову. Вельмі кранальна было назіраць за тым, як дзяўчаты з Азіі старанна вымаўлялі кожнае слова ў вядомых нам вершах М. Ю. Лермантава, Марыны Цвятаевай. Прагучалі творы пра Радзіму, пра каханне, пра сяброўства, пра жыццё ва ўсёй яго разнастайнасці. Удзельнікі паэтычнага свята закранулі балючую тэму вайны, а таксама тэму дзяцей на вайне.

Вельмі важным момантам свята паэзіі стаў удзел у ім юных паэтаў, якія парадавалі чытаннем уласных твораў. Нягледзячы на іх фармальную недасканаласць, у тэкстах маладых аўтараў прагучала галоўнае – душэўнасць, чалавечнасць, любоў да сваёй Радзімы. А ўдасканаленне майстэрства – гэта справа часу.

Кацярына Каламійцава і Дзмітрый Радзівончык павіншавалі прысутных з Сусветным днём паэзіі, пазнаёмілі інтэрнацыянальную моладзевую аўдыторыю з асаблівасцямі свайго творчага пошуку і некаторымі яго вынікамі. Не абмінулі ўвагай і мастацтва літаратурнага перакладу. Госці не толькі прачыталі свае вершы, але і запрасілі хлопцаў і дзяўчат да супрацоўніцтва з абласной пісьменніцкай арганізацыяй; зрабілі агульныя фотаздымкі на памяць. І зразумела, атрымалі шчырую ўдзячнасць ад арганізатараў літаратурнай гасцінай, выкладчыкаў кафедры рускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы Ірыны Мікалаеўны Кавінкінай і Галіны Чаславаўны Мазько, а таксама запрашэнне працягваць супрацоўніцтва ў межах праекта з прыгожай назвай «Садружнасць».

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

***На фота:*** свята інтэрнацыянальнай паэзіі ў літаратурнай гасцінай «У коле сяброў». ГАНБ імя Я. Карскага, 20 сакавіка 2025 года.




Вядучая свята, выкладчык кафедры рускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына Мікалаеўна Кавінкіна



Арганізатар мерапрыемства, бібліятэкар Лілія Леанідаўна Хадароўская







Запрошаныя госці, члены СПБ, паэты Кацярына Каламійцава і Дзмітрый Радзівончык


МЫ ГАНАРЫМСЯ
ВАЁЙ КРАІНАЙ


МЫ ГАНАРЫМСЯ
СВАЁЙ КРАІНАЙ
ЗРОБЛЕНА Ў
БЕЛАРУСІ
ГУК «Гродненская областная научная
библиотека имени Е.Ф. Карского»
УО «Гродненский государственный
университет имени Янки Купалы»


ГУК «Гродненская областная научная
библиотека имени Е.Ф. Карского»
«В кругу друзей»
Литературная гостиная
УО «Гродненский государственный
университет имени Янки Купалы»


ГУК «Гродненская областная научная
библиотека имени Е.Ф. Карского»
«В кругу друзей»
Литературная гостиная
ЗНАК ЯКАСЦІ










Кацярына Каламійцава






Дзмітрый Радзівончык


ГУК «Гродненская областная научная библиотека имени Е.Ф. Карского»
«В кругу друзей»
Литературная гостиная
УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»
ДЫМ БЕЗ ОГНЯ


Pica AI